УДК 811.161.3‟42:398.91:124.6

Я. П. Верашчагін

Навук. кір. – В. А. Ляшчынская, д-р філал. навук, прафесар

# ПРЫКАЗКІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ АБ ЛЁСЕ ЧАЛАВЕКА

У артыкуле прадстаўлены аналіз прыказак, выяўленых з парэміялагічных фондаў беларускай мовы паводле адной з ліку шматлікіх тэматычных груп як адзінак-характарыстык чалавека – чалавек і яго лѐс, чалавек пра свой лѐс. Выяўлена, што тэма лѐсу цесна звязана з верай, надзеяй чалавека ў лепшае, у справядлівасць, асабліва ў сябе і свае сілы, свой розум, выразна рэалізуецца праз семантычную апазіцыю „аптымізм – пессімізм‟ з перавагай аптымізму.

Прыказкі як устойлівыя адзінкі кожнай мовы вобразна, дакладна, ѐмка адлюстроўваюць светапогляд народа-стваральніка гэтых адзінак. У іх адлюстроўваецца вобразнае мысленне народа, зафіксаваны правілы і законы жыцця, гістарычны і культурны вопыт, шматлікія рэаліі, падзеі, абумоўленыя часам, тэрыторыяй і ўмовамі жыцця. Зразумела, прыказкі гэтым і цікавыя, іх трэба вывучаць, паколькі гэта дае ўсведамленне пра мудрасць народа, дазваляе засваенню нормаў паводзін, далучае кожнага прадстаўніка да адзінага цэлага – свайго народа. Каштоўнасць прыказак і ў тым, што «яны не пазбаўлены значэння самі па сабе, таму, што іх дасціпнасць часта такая ж свежая і мудрасць іх не менш актуальная, як і ў старадаўнасці» [1, с. 76-77]. Наша ўвага скіравана да прыказак адной тэматычнай групы з ліку шматлікіх – прыказак аб лѐсе чалавека, крыніцай збору якіх паслужылі слоўнікі [2; 3]. У парэміялагічным фондзе беларускай мовы шырока ўжываюцца ўстойлівыя выразы, у якіх можна многае пазнаць пра такія рысы характару беларусаў, як аптымізм, адвага, вытрымка, што ў многім прадвызначаюць ход жыццѐвых падзей, лѐс чалавека, які складваецца незалежна ад яго волі і жадання. Без наяўнасці ў характары гэтых псіхалагічных якасцей няма асобы, няма статусу чалавека, няма павагі да яго з боку іншых. У прыказках, што ўзніклі ў далѐкім мінулым, найперш адзначаецца сіла дзеяння прадвызначанага для кожнага чалавека лѐсу: Ад лѐсу не ўцячэш [2, с. 46]; Свайго лѐсу не мінеш [2, с. 367]; Суджанага і канѐм не аб‟едзеш [2, с. 389]; Чаму быць, таго не мінаваць [2, с. 367]; залежнасць лѐсу чалавека ад божай волі: На ўсѐ воля божая [2, с. 274]; Сам не асамішся, калі Бог не дасць [2, с. 366]; уяўленне аб шчасці як наканаванні лѐсам нямногім і перавазе шчасця над прыгажосцю: Не радзіся красны, а радзіся шчасны [2, с. 298]. Разам з тым, беларус найчасцей аддае перавагу духоўнаму над матэрыяльным, усведамляючы, што матэрыяльны дабрабыт чалавека – справа нажыўная і найбольш залежыць ад намаганняў самой асобы. Нават залежнасць ад Бога беларус пераводзіць на сябе, паколькі верыць у свае сілы і заклікае не спадзявацца на каго-небудзь, а прадпрымаць свае ўласныя дзеянні: На бога спадзявайся, а сам не давайся (не агінайся, не зявай) [2, с. 259]; Бог то Бог, але і сам не будзь жох [2, с. 72]. У прыказках часта гучыць упэўненасць чалавека ў сябе, цесна знітаваная якраз з верай у свае магчымасці і сілы забяспечыць уласныя матэрыяльныя патрэбы: Будзем жывы – не памром [2, с. 77]; Языкознание 156 выказваецца парада аб неабходнасці быць у жыцці энергічным, спрытным: Хочаш жыць – умей круціцца [2, с. 429], клапаціцца не толькі пра матэрыяльныя, але і пра духоўныя патрэбнасці: Не хлебам адзіным жыве чалавек [2, с. 306]. Асаблівае месца ў жыццѐвай пазіцыі беларуса займае вера ў добрае, надзея: Будзе калі-небудзь і на нашай вуліцы свята [2, с. 76]; Будзе і на нашым рынку кірмаш [2, с. 76]; Надзея памірае апошняй [2, с. 263]; Перамелецца – мука будзе [2, с. 338]; Загляне сонца і ў наша аконца [2, с. 158]; спадзяванне на лепшае: Над сіратою Бог з калітою [2, с. 264]. Нават няшчасце беларус успрымае па-свойму, бачыць штосьці светлае, добрае: Не было б шчасця, ды няшчасце памагло [2, с. 281]; Няма ліха без дабра [2, с. 315]; Няма таго злога, каб не выйшла на добрае [2, с. 317]. Асаблівая вера беларуса ў праўду, перамогу добрага над злым: Усѐ мінецца, а праўда застанецца [2, с. 413]; Усѐ на свеце мае свой канец [2, с. 413]; Праўду не схаваеш [2, с. 346]; Праўда наверх выйдзе [2, с. 346]; Лепш горкая праўда, чым салодкая мана [2, с. 234]. І гэта пры тым, што

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

беларус бачыць сацыяльную несправядлівасць: Адны пануюць, другія гаруюць [2, с. 52]; Палавіна свету скача, а другая палавіна свету плача [2, с. 329]; Так на свеце вядзецца: адзін плача, другі смяецца [2, с. 394]; беды і няшчасці: Адна бяда не ідзе, другую за сабой вядзе [2, с. 47]; Адна бяда не ходзіць [2, с. 47]; Бяда па бядзе як па нітачцы ідзе [2, с. 82]; Бяда не па лесе, а па людзях ходзіць [2, с. 82]; Не шукай бяды, яна сама цябе знойдзе [2, с. 308]; Ніхто не чуе, дзе бяда начуе [2, с. 308]; ліха і гора: Еду ціха – са мной ліха, еду скора – са мной гора [2, с. 149] і інш. Але і пры гэтым беларус бачыць добрае, шукае выйсце, суцяшэнне: Адна бяда – не бяда [2, с. 47]; Бяда хоць мучыць, ды жыць вучыць [2, с. 82]; Без мукі няма навукі [2, с. 65]; Гора плача, гора скача, гора песенькі пяе [2, с. 107]; З гора і курыца заспявае [2, с. 169]. Аналіз зместу прыказак паказвае, што ў нацыянальным характары беларусаў прысутнічаюць найперш дзве семантычна супрацьпастаўленыя псіхалагічныя рысы – аптымізм і песімізм. Пры гэтым назіраецца перавага прыказак з семантызацыяй аптымізму як адметнай рысы характару, што можна патлумачыць пэўнай расстаноўкай прыярытэтаў нашымі продкамі. Так, беларус заўсёды скіроўвае ўвагу да розуму чалавека: Калі Бог захоча пакараць каго, дык пазбаўляе розуму [2, с. 196]; Не шукай багацця, а шукай розум [2, с. 308]; Каб той розум наперад, што пазней прыходзіць [2, с. 193]. 157 Іншымі словамі, беларус умее радавацца таму, што мае, цэніць ужо здабытае або атрыманае і верыць у свае сілы, розум, якія дапамагаюць у цяжкія моманты. І аптымізм беларускага народа знаходзіць выяўленне ў разуменні таго, што шкадаваннем, смуткам, плачам па страчанаму яго не вернеш ці па згубленаму, паколькі з плачам новага не набудзеш: Слязаміі гору (бядзе) не паможаш [2, с. 380]; Плачучы рот не паправіш [2, с. 343]; Плакаў, плакаў, а бог аднакаў, пачаў танцаваць, пачало шанцаваць [2, с. 342]; Плакаў, плакаў – усѐ бог аднакаў, пачаў пяяць (спяваць) – стаў бог даваць [2, с. 342]. Прадстаўнік беларускага этнасу заўсѐды знаходзіць альтэрнатыву, выйсце са складанай жыццѐвай сітуацыі: Калі не нажнѐм, то назбіраем [3, с. 87]; Калі не намалоцім, то накалоцім [3, с. 87]; Не сілаю, то розумам [3, с. 98]. Не губляецца ѐн і ў самых безвыходных сітуацыях. Гэта сведчыць пра выключную кемлівасць і знаходлівасць беларуса, аптымізм і веру ў тое, што безвыходных сітуацый не бывае, што заўсѐды пры жаданні можна знайсці спосаб паляпшэння свайго матэрыяльнага дабрабыту. Таму беларусы мяркуюць: Лепей жартаваць, чымся гараваць [3, с. 167]; Абы ўмеў (умела) танчыць, а гараваць (рабіць работу) гора наўчыць [2, с. 37]. Такі аптымізм – гэта і спосаб выжыць, і, відаць, свядомае разуменне таго факта, што смутак і плач – гэта не спосаб пераадолення жыццѐвых цяжкасцей і не сэнс жыцця: Каб не смяяліся і не цешыліся, дык даўно павесіліся б [2, с. 191]; Мужык не пасмяяўся, то з гора зайшоўся б [3, с. 191]; Смех не грэх, а галавы не вешай [3, с. 216]; Пакінь вешаць нос, не дзеля гэтага рос [3, с. 175]. Неабходна адзначыць, што многія прыказкі беларусаў семантызуюць вялікую сілу волі, супрацьстаянне беларускага народа ўсім бедам і няшчасцям, якія падсцерагалі нашых продкаў на працягу гісторыі. Вызначаюцца сваім сэнсавым зместам моўныя адзінкі, якія нясуць у сабе думку пра тое, што чалавек павінен з годнасцю пераносіць усе выпрабаванні, якія сустракаюцца на яго жыццѐвым шляху. І тут відавочна, што беларусы вылучаюцца адэкватным успрыманнем гора ці бяды, цвяроза ацэньваючы становішча, разумеюць, што можа быць яшчэ горш: Дасць бог дзень, дасць і полудзень (хлеб, ежу, нажытак) [2, с. 126]; Пераважылі лета гарачае, пераважывѐм і дзярмо сабачае [3, с. 142]; Адвагаю і пекла пяро йдзеш [3, с. 48]; Даўней было складаней [3, с. 59]; Не так чорт страшны, як яго малююць [2, с. 302] і інш. Языкознание 158 Вера беларусаў у лепшае трывалая, шчырая, і менавіта вера ѐсць аснова аптымізму. Разам з верай у свае магчымасці пераадолець любыя выпрабаванні і цяжкасці жыцця, дачакацца лепшай будучыні для сябе і сваіх дзяцей аптымізм нашых продкаў мацуецца іх верай у абавязковае дасягненне праўды і справядлівасці на тым свеце, дзе кожны атрымае па заслугах: Хто з богам, з тым і бог [2, с. 432]. Аптымістычнае стаўленне беларусаў да жыцця замацоўваецца і выяўляецца ў іх паводзінах і рысах нацыянальнага характару, сярод якіх хочацца адзначыць жыццястойкасць: Багаты дзівіцца, чым бедны жывіцца [2, с. 61], сумленнасць: Няма большай кары, чым кара свайго сумлення [2, с. 314], цярплівасць: Цярпі, Грышка, карчма блізка [2, с. 450]; Цярпі, Зося, так прыйшлося! [2, с. 450]; Цярпі, казак, атаманам будзеш [2, с. 450], вытрыманасць, не баяцца цяжкасцей: Ваўкоў баяцца – у лес не

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

хадзіць [2, с. 85]; дбайнасць і працавітасць: Хто дбае, той і мае [2, с. 431]; Хто гняздо ўе, у таго і ўецца [2, с. 431]; Хто не працуе, той не есць [2, с. 436]; Як дбаеш, так і маеш [2, с. 484]. Разважлівасць і схільнасць да ўнутранага псіхалагічнага аналізу забяспечвае беларусу не толькі бадзѐры настрой і аптымістычны погляд на свет, але і ўменне заўважаць, што жыццѐ дынамічнае, няўстойлівае, зменлівае, знаходзіцца ў няспынным руху і развіцці: Усѐ добра, што добра канчаецца [2, с. 412]; Усѐ новае – гэта добра забытае старое [2, с. 413]. Вобразная аснова некаторых прыказак, што рэпрэзентуюць лѐс чалавека, ствараецца дзякуючы назоўнікам надзея і цярпенне. Безумоўна, толькі надзея на лепшае і цярпенне, здольнасць чалавека стойка пераносіць жыццѐвыя нягоды дазваляе яму выстаяць, не зламацца ў самых складаных жыццѐвых сітуацыях: Без надзеі і жыццѐ не жыццѐ [3, с. 47]; Спадзявайся на лепшае, а бойся напаткаць горшае [3, с. 243]; Чаго субоце раней за пятніцу быць [2, с. 452] і інш. Калі шчаслівую бесклапотнасць няўмольна змяняе паласа цяжкасцей і выпрабаванняў, тады жыццѐвы аптымізм – бадзѐры і жыццярадасны – можа саступіць месца песімізму. Гэта вытлумачальна і цалкам заканамерна для беларускага народа, выпрабаванні ў жыцці якога праз шматгадовы сацыяльна-палітычны прыгнѐт і шматпакутную гісторыю, сацыяльную няроўнасць і несправядлівасць, доўгую адсутнасць дзяржаўнасці і іншыя падобныя да таго рэальныя абставіны існавання нярэдка зацягваліся і станавіліся на пэўны час няўмольнай нормай жыцця. З гэтай прычыны ў мінулыя часы нашым народам была створана вялікая колькасць афарыстычных выслоўяў, у якіх рэпрэзентуецца песімізм як нявер�|е ў будучае, схільнасць бачыць ва ўсім толькі 159 адмоўнае: Цешышся старац, што перажыў марац, ажно ў маю нясуць яго да гаю [2, с. 446]; Чалавек страляе, а бог кулю носіць [2, с. 455]; Чалавек страляе, а Бог кулю носіць [2, с. 455]; Час ад часу не лягчэй [2, с. 455] і інш. І ўсѐ ж песімістычны настрой у любым выпадку змяняецца аптымістычным, паколькі разважлівасць дапамагае чалавеку асэнсаваць тыя цяжкасці і выпрабаванні, якія выпадаюць на лѐс чалавек: Ад напасці не прапасці [2, с. 44]; Будзе час – будзе і квас [2, с. 78], убачыць перавагу мужыка і яго сілу: Голь на выдумку вострая (хітрая) [2, с. 107]; Што лапці сплятуць, таго боты не разблытаюць [2, с. 472] і інш. Такім чынам, аналіз парэмій абранай тэматычнай групы дазваляе зрабіць вывад аб перавазе ў беларускім нацыянальным характары веры ў сябе, надзеі на лепшае, аптымізму адносна лѐсу як рэпрэзентацыі традыцыйнай народнай культуры, нацыянальнай карціны свету беларускага народа і вызначэнні адной са станоўчых рыс характару чалавека, яго жыццѐвай сілы.
Спіс літаратуры 1 Тайлор, Э. Б. Первобытная культура / Э. Б. Тайлор; пер. с англ. – М. : Изд-во политической литературы, 1989. – 573 с. 2 Лепешаў, І. Я. Слоўнік беларускіх прыказак / І. Я. Лепешаў, М. А. Якалцэвіч. – Мінск : Бел. асац. «Конкурс», 2006. – 544 с. 3 Іванова, С. Ф. Слоўнік беларускіх прыказак, прымавак і крылатых выразаў : лінгвакраіназнаўчы дапаможнік / С. Ф. Іванова, Я. Я. Іваноў. – Мінск : Беларускі Фонд Сораса, 1997. – 264 с.
РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ